Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №2 імя М.П.Масонава
г. Свіслачы”

«Скарбы маёй сям’і»
Намінацыя “Ад прадзедаў спакон вякоў…”

# Возера вернасці

Волк Алёна, вучаніца 11 “А” класа
дзяржаўная установа адукацыі
“Сярэдняя школа №2 імя М.П.Масонава г. Свіслачы”

Свіслач, 2022

# Возера Вернасці

Што такое каханне? Гэтае пытанне, напэўна, кожны чалавек задае сабе рана ці позна. Але вось адказ знаходзяць не ўсе. Упершыню такое пытанне я задала сабе, калі мне споўнілася толькі пяць гадоў. Тады я дала каханню такое вызначэнне: «Гэта калі мама і тата надаюць табе шмат увагі і купляюць прысмакі і цацкі". У восем гадоў я зноў задалася гэтым пытаннем. Але нават і тады маё вызначэнне кахання было далёка ад ідэалу: "Гэта калі хлопчык заступаецца за дзяўчынку і дае ёй шакаладку". Вельмі смешна!

Мне ўжо дванаццаць, і я цяпер разумею, што каханне - гэта адданасць любімаму чалавеку, сапраўдныя і шчырыя пачуцці. Людзі, якія па-сапраўднаму любяць , пераадолеюць разам усе перашкоды, яны будуць падтрымліваць адзін аднаго, нягледзячы ні на якія цяжкасці і акалічнасці. Назіраць за закаханымі парамі вельмі цікава: яны выглядаюць шчаслівымі, у іх вочы ззяюць ад шчасця і любові.

Цікавую легенду пра каханне расказала мне мая бабуля, а ёй – яе бабуля, праўда, тая была перакананa, што гэта не легенда, а самая што ні на ёсць быль.

Дык вось. У даўнія-даўнія часы жыў недзе недалека ад вёскі Занкі, што цяпер у Свіслацкім раёне, адзін пан. Быў ён вельмі багаты, але найбольшым багаццем лічыў сваю дачку Міхаліну. Была яна вельмі прыгожая, стройная, чарнабровая, чарнавокая і валасы мела залатыя, як каласы ў спелай пшаніцы. Штодзень пакаёўка заплятала ёй доўгія косы і ўкладала на галаве, як карону. Была яна трошкі капрызнай і наравістай, але сэрца ўсё ж мела добрае, нікога не крыўдзіла, не абражала, нават любіла бавіцца ў садзе з малымі дзецьмі сваіх служанак.

Быў у Міхаліны конь Огнік, якога бацька падарыў ёй на 18-годдзе. Дзяўчына вельмі любіла Огніка і часта ездзіла на ім верхам..

Аднойчы, калі Міхаліна прагульвалася па лесе, Огнік раптам спатыкнуўся і дзяўчына ўпала на зямлю. Ад нечаканасці і болю ў назе яна ўскрыкнула і пачала клікаць на дапамогу, хоць разумела, што яе наўрад ці хто

пачуе ў лесе. І якім жа было яе здзіўленне, калі раптам з-за хвоек на паляну выйшаў высокі прыгожы юнак. Ён падышоў да дзяўчыны, хацеў дапамагчы ёй сесці на каня, але яна зноў моцна застагнала, бо вельмі балела нага. І тады юнак ўзяў яе на рукі і панёс. Так прынес ён Міхаліну да самага дома. Бацька падзякаваў яму, запытаў, як завуць. Хлопец назваўся Антосем, пакланіўся гаспадару, дзяўчыне і пайшоў зноў у лес, бо быў её дрывасекам і служыў у таго ж самага пана.

А Міхаліна не магла забыцца на таго юнака, і як толькі нага перастала балець, яна паспяшалася ў лес на тую паляну, дзе ўпершыню сустрэлася з Антосем. Яна не вельмі спадзявалася, што зноў яго ўбачыць, але юнак нібы чакаў яе там. З таго часу яны бачыліся амаль штодзень. І моцна-моцна пакахалі адзін аднаго.

А тут аднаго разу бацька паклікаў Міхаліну і сказаў ёй, што знайшоў для яе жаніха – сына вяльможнага пана, з якім часта хадзіў на паляванне.
Міхаліна ж сказала бацьку, што не выйдзе за яго замуж, бо даўно кахае другога. Пан быў здзіўлены і запытаўся , каго менавіта, чаму ён нічога не ведае. І тады Міхаліна прызналася бацьку, што кахае Антося, таго, хто прынёс яе на руках дадому, калі яна ўпала з каня. Дзяўчына думала, што бацька і на гэты раз саступіць ёй, як гэта было заўсёды, але раптам голас ў яго стаў суровым, вочы зрабіліся халоднымі і злымі.

- Што? Якога Антося? Каб я за галадранца аддаў адзіную дачку. Бач, што ён удумаў. Ды яго засяку, згнаю, знішчу!

Міхаліна ніколі яшчэ не бачыла бацьку такім. Яна раптам вельмі-вельмі спалохалася і не за сябе, а за Антося. Зразумела - бацька не жартуе.

- Добра, добра, тата, супакойся, няхай будзе на-твойму, - сказала дзяўчына, каб суняць бацькоўскі гнеў. А потым яна што-небудзь прыдумае. І яны з Антосем усё роўна будуць разам.

- Вось і малайчына. Бацьку трэба слухаць.

Бацька выйшаў з дома і паклікаў сваіх гайдукоў. Загадаў ім знайсці таго хлопца і звесці яго са свету.

На другі дзень раніцай паехалі гайдукі ў лес, каб знайсці таго хлопца, а яго і шукаць не трэба было, ён, як заўсёды, раненька чакаў на паляне сваю любую Міхаліну. Схапілі гуйдукі Антося, засеклі яго бізунамі да смерці, выкапалі на той паляне яму, пахавалі ў ёй юнака і зверху завалілі вялікім камнем.

Бацька загадаў Міхаліне быць дома і нікуды не адлучацца, але яна не паслухалася і ўпотай паскакала раніцай на Огніку ў лес. Прыехала, бачыць няма нікога, только сярод паляны вялізны камень ляжыць. Падышла бліжэй, азірнулася кругом, пачала клікаць любага, але ніхто ёй не адклікнуўся. Раптам бычыць, з-пад каменя вада струменіць. Чыстая такая, празрыстая. І вось ўжо з'явілася маленькае азярцо і робіцца ўсё большым і большым. Адкуль ні вазьміся да каменя птушачка прыляцела, прыгожанькая такая, і так сумна заспявала, што Міхаліна заплакала. Здагадалася яна, што гэта душа яе любага Міхася да яе прыляцела, а сам ён ляжыць пад гэтым каменем, і крыніца тая – яго слёзы аб іх загубленым каханні. Раптам адчула дзяўчына, што ногі яе ўрастаюць у зямлю і становяцца каранямі, тонкі стан здзервянеў і ператварыўся ў ствол, рукі – у галіны, а косы расплялiся самі, і кожная валасінка стала танюсенькай галінкай вярбы, якая схіліліся да самай вады. Вярбою стала Міхаліна, каб навекі застацца з любым.

Бацька, даведаўшыся, што дачка ўцякла, паслаў гайдукоў яе шукаць і прывесці дадому. Прыязджаюць гайдукі на тую паляну, глядзяць – каля каменя возера разлілося, побач вярба стаіць, а воддаль шчыпле зялёную траву Огнік. Забралі яны каня, прывялі дадому і сказалі, што не знайшлі Міхаліны.

Доўга гараваў бацька, чакаў, што вернецца яго дачушка, а потым захварэў і памёр.

Паляну ж тую людзі назвалі Палянай Кахання, а возера – Возерам Вернасці. Яно, на жаль, даўно высахла, як і вярба, а крыніца тая да сёння існуе. Туды прыходзяць закаханыя, каб прысягнуць адзін аднаму ў вернасці.

А вада з той крыніцы, кажуць, ачышчае душы людзей, робіць іх добрымі і шчырымі, а каму пашчасціць пачуць спеў тае птушкі, той будзе вельмі шчаслівым.

Такую вось сумную гісторыю расказала мне бабуля, а ёй – яе бабуля, пераконваючы, што гэта не легенда, а быль. І мне вельмі хочацца, каб так яно і было.

З даўніх часоў побач з каханнем ідзе расстанне. Часам расстанне закаханых бывае вечным, як у Міхаліны і Антося. І тады нам застаюцца легенды пра загубленае каханне.

На шчасце, наша пакаленне мае права кахаць і рабіць свой выбар без загаду бацькоў. Таму на вуліцах часта сустракаюцца шчаслівыя закаханыя. Мае равеснікі цяпер у тым узросце, калі вось-вось прыйдзе вялікае і сапраўднае каханне. Яно прыйдзе, калі верыць у яго існаванне, нягледзячы на цяперашнія размовы, што сучасная моладзь не здольная на сапраўдныя пачуцці. Хай балбочуць цынікі! Я ж буду верыць, што мяне знойдзе каханне. І яно не будзе падобным ні на якое іншае. Таму што гэта будзе маё каханне.